Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай працы
і адукацыйных навацыях
_____________ В. І. Чупрыс
«05» 07 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД - 8536/вуч.

# ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ ПАДЫХОД У НАВУЧАННІ МОВЕ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:**

1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)

2019 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 1-21 05 01-2013 і вучэбных планаў УВА D-21-079/ вуч., D-21-080/ вуч., D-21-081/ вуч. ад 30.05.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
**Саматыя І.М.**, дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТ:**
**Кныш А.С.**, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ДУА «СШ №125 г.Мінска»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры
(пратакол № 6 ад 12 снежня 2018 г.);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 2 ад 28 снежня 2018 г.)

Заг.кафедры
рыторыкі і методыкі
выкладання мовы і літаратуры
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
кандыдат педагагічных навук, дацэнт І.У.Таяноўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

## Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны

**Мэта** вучэбнай дысцыпліны: падрыхтаваць студэнтаў да ўспрымання вучэбнага прадмета “Беларуская мова” ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі не толькі як вучэбнай дысцыпліны, але і як сродку пазнання рэчаіснасці, развіцця і выхавання асобы праз рэалізацыю новых падыходаў у навучанні (сістэмна-функцыянальны, камунікатыўна-дзейнасны, кампетэнтнасны, культуралагічны).

**Задачы вучэбнай дысцыпліны:**

1. Стварыць тэарэтычную базу для асэнсавання студэнтамі асновы зместу навучання беларускай мове: псіхалагічнай, лінгвістычнай і педагагічнай.
2. Ахарактарызаваць сістэму беларускай мовы ў *функцыянальна-семантычным* плане: што такое мова? для чаго яна існуе? якія рэсурсы мае? што абазначаюць моўныя адзінкі? як яны функцыянуюць (іх прызначэнне)? *як імі правільна, пісьменна карыстацца?*
3. Разгледзець лінгвістычную тэорыю не як самакаштоўнасць, а як сродак дасягнення мэты моўнай адукацыі.
4. Пазнаёміць студэнтаў са своеасаблівым апісаннем моўнай сістэмы, якое “аднаўляе інвентар сродкаў, якімі валодае той, хто гаворыць, і мадэліруе яго дзейнасць па адборы неабходных для гэтага сродкаў”.
5. Пазнаёміць з прынцыпамі адбору асобасна арыентаванага зместу як асновы фарміравання моўнага ядра асобы.

**Месца вучэбнай дысцыпліны** ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.

Вучэбная дысцыпліна адносіцца да цыклу дысцыплін спецыялізацыі.

**Сувязі** з іншымі навучальнымі дысцыплінамі, уключаючы навучальныя дысцыпліны кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі, дысцыпліны спецыялізацыі і інш.

Пры стварэнні вучэбнай праграмы ўлічаны зместава значныя сувязі з іншымі дысцыплінамі вучэбнага плана, у прыватнасці – дысцыплінамі “Сучасная беларуская мова”, “Педагогіка” і інш.

**Патрабаванні да кампетэнцый**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне наступных акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый:

***Акадэмічныя*** кампетэнцыі:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным прадуцыраваць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).
АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем.
АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прыстасаванняў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп’ютарам.
АК-8. Мець навыкі вуснай і пісьмовай камунікацыі.
АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

***сацыяльна-асобасныя*** кампетэнцыі:
САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.
САК-2. Быць здольным да сацыяльных кантактаў.
САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый.
САК-6. Умець працаваць у калектыве.

***прафесійныя*** кампетэнцыі:
ПК-1. Планаваць, арганізоўваць і весці педагагічную (вучэбную, метадычную, выхаваўчую) дзейнасць.
ПК-2. Выкарыстоўваць розныя тэхналогіі навучання мове.
ПК-4. Ажыццяўляць маніторынг адукацыйнага працэсу, дыягностыку вучэбных і выхаваўчых вынікаў.
ПК-7. Выкарыстоўваць у працы сучасныя камп'ютарныя метады збору, апрацоўкі і захавання інфармацыі.
ПК-10. Карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай на беларускай, рускай і замежных мовах.
ПК-14. Выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці навыкі педагагічных (дзелавых) кантактаў.
ПК-15. Узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных спецыяльнасцей.
ПК-17. Рыхтаваць даклады, матэрыялы для прэзентацый і кіраваць імі.
ПК-18. Выкарыстоўваць сучасныя сродкі тэле-і інтэрнэткамунікацый.
ПК-20. Ажыццяўляць пошук, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па перспектывах развіцця галіны, інавацыйных тэхналогіях, праектах і рашэннях.
ПК-24. Авалодваць інавацыйнымі адукацыйнымі тэхналогіямі і ўкараняць іх у навучальны працэс.

У выніку асваення вучэбнайдысцыпліны студэнт павінен:

**Ведаць**: тэарэтычную базу зместу навучання беларускай мове (псіхалагічную, лінгвістычную і педагагічную); функцыі роднай мовы ў грамадстве; прынцыпы адбору асобасна арыентаванага зместу як асновы фарміравання моўнага ядра асобы.

**Умець** характарызаваць сістэму беларускай мовы ў *функцыянальна-семантычным* плане і выкарыстоўваць гэтыя веды на практыцы.

**Валодаць уменнямі** ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з нарматыўна-прававымі дакументамі сферы адукацыі; ажыццяўляць прафесійную дзейнасць па ўдасканаленні маўленчай дзейнасці навучэнцаў ва ўмовах абнаўлення зместу навучання беларускай мове, змены тэхналогій.

**Структура вучэбнай дысцыпліны**

Дысцыпліна вывучаецца ў 3-м семестры. Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Функцыянальны падыход у навучанні беларускай мове" адведзена:
– для вочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі – 54 гадзіны, у тым ліку 34 аўдыторныя гадзіны, з іх: лекцыі – 20 гадзін, практычныя заняткі – 10 гадзін, кіруемая самастойная праца – 4 гадзіны.
Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 1,5 заліковыя адзінкі.
Форма бягучай атэстацыі – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел 1.

**Тэма 1. Паняцце функцыянальнай лінгвістыкі. Асноўныя напрамкі функцыянальнай лінгвістыкі**

1.1. Паняцце традыцыйнай і функцыянальнай лінгвістыкі.

1.2. Асноўныя перадумовы ўзнікнення напрамку функцыянальнай лінгвістыкі функцыянальнага падыходу да апісання моўных з'яў.

1.3. Асноўныя напрамкі функцыянальнай лінгвістыкі ў айчынным і замежным мовазнаўстве.

1.4. Паняцце функцыі ў функцыянальнай граматыцы.

**Тэма 2. Паняцце функцыянальнага падыходу ў методыцы выкладання лінгвістычных дысцыплін**

2.1. Перадумовы з'яўлення функцыянальнага падыходу ў методыцы вывучэння лінгвістычных дысцыплін.

2. 2. Мэты і задачы функцыянальнага падыходу ў методыцы.

2. 3. Разнавіднасці функцыянальнага падыходу да вывучэння лінгвістычных дысцыплін.

### Раздзел 2.

**Тэма 3. Роля беларускай мовы ў жыцці грамадства**

3.1.1. Функцыі мовы: камунікатыўная функцыя; намінатыўная, або функцыя называння; функцыя адлюстравання; пазнавальная функцыя; экспрэсіўная функцыя; эстэтычная функцыя; апелятыўная функцыя; метамоўная функцыя; гістарычная функцыя; этнічная функцыя.

3.1.2. Улік функцый феномену мовы ў навучанні беларускай мове.

**Тэма 4. Сістэма сярэдняй адукацыі ў Беларусі і месца ў ёй беларускай мовы як вучэбнай дысцыпліны**

4.2.1. Розныя перыяды станаўлення школы і змянення разумення месца беларускай мовы.

4.2.2. Асаблівасці сучаснай сістэмы адукацыі і перспектывы іх удасканалення.

4.2.3. Дзяржаўны адукацыйны стандарт.

**Тэма 5. Прынцып навучання беларускай мове як поліфункцыянальнай з'яве**

5.1. Мэты навучання беларускай мове. Фарміраванне кампетэнцый.

5.2.Суадносіны функцый мовы і кампетэнцыі навучання.

**Тэма 6. Перспектыўныя педагагічныя тэхналогіі.**

**Раздзел 3.**

**Тэма 7.Вывучэнне фанетыкі ў функцыянальным аспекце**

7.1.1. Асноўныя напрамкі вывучэння фанетыкі. 7.1.2. Фаналогія як аспект функцыянальнага апісання фанетычнай сістэмы. 7.1.3. Характарыстыка асноўных метадаў вывучэння фанетыкі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

**Тэма 8.Функцыянальны падыход да вывучэння словаўтварэння**

8.2.1. Асноўныя падыходы да вывучэння словаўтварэння.

8. 2.2. Функцыянальны падыход да вывучэння словаўтварэння.

**Тэма 9.Функцыянальны падыход да вывучэння лексікалогіі і лексікаграфіі**

9.1. Асноўныя падыходы да вывучэння лексікалогіі і лексікаграфіі. 9.2.Функцыянальны падыход да вывучэння лексікалогіі. 9.3.Паняцце функцыянальнай аманіміі. 9.4. Семасіялагічны і анамасіялагічны аспекты прадстаўлення моўнага матэрыялу.

**Тэма 10.Вывучэнне марфалогіі ў функцыянальным аспекце.**

10.1. Функцыянальны падыход да вывучэння граматыкі. 10.2. Паняцці актыўнай і пасіўнай граматыкі ў працах Л.У. Шчэрбы. 10.3. Адмоўны моўны матэрыял і яго роля пры вывучэнні мовы.

**Тэма 11.Вывучэнне сінтаксісу ў функцыянальным аспекце**

11.1. Аспекты вывучэння сінтаксічных адзінак (лагічны аспект, структурны аспект, камунікатыўны аспект, структурна-семантычны аспект, функцыянальны). 11.2.Пераемнасць паміж традыцыйнымі кірункамі ў вывучэнні сінтаксісу (фармальна-граматычным, лагічным і псіхалагічным) і сучаснымі ўяўленнямі аб шматаспектнасці сказа.

**Тэма 12. Функцыянальна- камунікатыўны аспект працы з тэкстам пры вывучэнні беларускай мовы. Аналіз урокаў беларускай мовы з выкарыстаннем камунікатыўнага падыходу**

12.1. Тэкстацэнтрызм як адзін з вядучых падыходаў да вывучэння беларускай мовы. 12.2. Асноўныя напрамкі работы з тэкстам у лінгвістыцы і методыцы. 12.3.Функцыянальна-камунікатыўны падыход да працы з тэкстам і яго асаблівасці.

12.4. Метады і прыёмы функцыянальна-камунікатыўнай методыкі пры навучанні беларускай мове. 12.5. Распрацоўка і абарона ўрока беларускай мовы з выкарыстаннем камунікатыўнай методыкі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Дзённая форма атрымання адукацыі

| Нумарраздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Количество аудиторных часов | | | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыя | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Ікср | |
| 1 | | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | Паняцце функцыянальнай лінгвістыкі. Асноўныя напрамкі функцыянальнай лінгвістыкі | 1 | | | | | Суразмоўніцтва |
| 2 | Паняцце функцыянальнага падыходу ў методыцы выкладання лінгвістычных дысцыплін | 1 | | | | | Агляд літаратуры |
| 3 | Роля беларускай мовы ў жыцці грамадства | 2 | | | | | Эсэ |
| 4 | Сістэма сярэдняй адукацыі ў Беларусі і месца ў ёй беларускай мовы як вучэбнай дысцыпліны. Арганізацыя вучэбнага працэсу па беларускай мове | 2 | | | | | Паведамленне |
| 5 | Прынцып навучання беларускай мове як поліфункцыянальнай з'яве | 1 | | | | | Суразмоўніцтва |
| 6 | Перспектыўныя педагагічныя тэхналогіі | 4 | | | | | Рэферат і паведамленні |
| 7 | Вывучэнне фанетыкі ў функцыянальным аспекце | 1 | 1 | | | | Падрыхтоўка фрагментаў канспекта ўрока з выкарыстаннем прэзентацыі |
| 8 | Функцыянальны падыход да вывучэння словаўтварэння | 1 | 1 | | | | Падрыхтоўка фрагментаў канспекта ўрока з выкарыстаннемм відэаматэрыялаў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 9 | Функцыянальны падыход да вывучэння лексікалогіі і лексікаграфіі | 2 | 2 | | | | Падрыхтоўка творчага задання ”Ролік школьных навінаў з выкарыстаннем ведаў, атрыманых на ўроку”. |
| | | | | | | 2 | КСР № 1. Аналіз вучэбных дапаможнікаў “Беларуская мова: 5-6 класы” (аналітычны тэкст-характарыстыка) |
| 10 | Вывучэнне марфалогіі ў функцыянальным аспекце. | 1 | 2 | | | | Падрыхтоўка творчага сітуатыўнага задання |
| 11 | Вывучэнне сінтаксісу ў функцыянальным аспекце | 2 | 2 | | | | Творчае заданне: падрыхтоўка відэаматэрыялаў пра функцыянаванне сінтаксічных адзінак у маўленні |
| | | | | | | 2 | КСР № 2. Аналіз вучэбных дапаможнікаў “Беларуская мова: 7-9 класы” (аналітычны тэкст-характарыстыка) |
| 12 | Функцыянальна-камунікатыўны аспект працы з тэкстам пры вывучэнні беларускай мовы.<br>Аналіз урокаў беларускай мовы з выкарыстаннем камунікатыўнага падыходу | 2 | 2 | | | | Творчае заданне: падрыхтоўка практыка-арыентаваных матэрыялаў па напісанні творчых прац– віншаванне, водзыў, рэпартаж і інш. Пратаколы абмеркавання відэаўрокаў |
| | **Усяго гадзін** | 20 | 10 | | | 4 | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Пералік асноўнай літаратуры

1. Беларуская мова : вучэбныя дапаможнікі для 5-11 класаў устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання // e-padruchnik.adu.by
2. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для VIII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання – 2018г.// e-padruchnik.adu.by
3. Вучэбныя праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для V–VII класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання – 2017г. // e-padruchnik.adu.by
4. Вучэбныя праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для IX класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання – 2018г. // e-padruchnik.adu.by
5. Выкладанне беларускай мовы ў школе / М.Г. Яленскі, Л.С.Васюковіч, І.М.Саматыя і інш. – Мн.: Народная асвета, 1994. – 239с.
6. Жуковіч, М.В. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры: дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / М.В. Жуковіч. – Мінск: Аверсэв, 2015.
7. Король, А.Д. Основы эвристического обучения: учеб. пособие / А.Д.Король, И.Ф.Китурко. – Минск: БГУ, 2018.
8. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М.Г.Яленскі [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007.
9. Саматыя І. М. Нацыянальная мова: прадмет вывучэння і сродак навучання. Народная асвета. 2016. № 5. С. 15.
10. Яленскі, М.Г. Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш.. адукацыі / М.Г.Яленскі.– Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 224с.

### Пералік дадатковай літаратуры

1. *Бадзевіч, З.І.* Беларуская мова. Тэставыя заданні. 8 клас. У 2 ч. Ч. 2 : дапаможнік для настаўнікаў устаноў сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання /З.І. Бадзевіч, І.М.Саматыя. – Мазыр : Белы вецер, 2017. – 50с.
2. Бадзевіч, З.І. Беларуская мова. Тэставыя заданні. 8 клас. У 2 ч. Ч.1: дапаможнік для настаўнікаў устаноў сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання /З.І. Бадзевіч, І.М.Саматыя. – Мазыр : Белы вецер, 2017. – 66с.
3. Беларуская мова : навучальныя і кантрольныя дыктанты : 5-9 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М.Валочка [і інш.]. – Мінск : Аверсэв, 2016. – 224с. – (Кантрольна-вымяральныя матэрыялы).
4. *Браім, Т. Л.* Асаблівасці навучання замежнай мове ў параўнанні з роднай мовай / Т.Л. Браім // Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования: сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т; в авт. ред. – Мінск, 2013. – Вып. 12. – С. 9–13.
5. *Валочка, Г.М.* Дыдактычны матэрыял па беларускай мове. 7 клас: дапам. для

настаўнікаў устаноў агул. сярэд.ю адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка, С.А. Язерская. – Мазыр: Белы Вецер, 2014.
6. Вучыцеся са смакам! // http://padabayki.ru Дата доступу 20.10.2018
7. Дыдактычны матэрыял па беларускай мове: 8-ы кл.: дапам. для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з белар. і рус. мовамі навучання / З.І. Бадзевіч, І.М. Саматыя. – Мінск: НІА, 2015. – 186с.
8. Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за перыяд навучання і выхавання на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі: тэксты для пераказаў / склад.: Г.М.Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі; Аверсэв, 2013, 2014.
9. *Іўчанкаў, В.І.* Беларускі правапіс у апорных схемах: паводле новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.І. Іўчанкаў. – Мінск: Пачатковая школа, 2013.
10. Карач, Д.М. Выкарыстанне метаду актыўнай ацэнкі на ўроках беларускай мовы /Д.М. Карач // Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования: сб. науч. Ст. / Белорус. Гос. Ун-т; в авт. Ред. – Мінск, 2013. – Вып. 12.
11. Лобань, М.А.Эфектыўнасць выкарыстання метаду праектавання ў адукацыйным працэсе / М.А.Лобань // Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования: сб. науч. Ст. / Белорус. Гос. Ун-т; в авт. Ред. – Мінск, 2013.– Вып. 12.
12. Лявончык, М. Маўленчыя прыёмы характарыстыкі чалавека: метадычна накіраванае адлюстраванне/ І.Таяноўская, М.Лявончык. – Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/bitstream/123456789/30028.– Дата доступу: 2019.
13. Нікалаенка, Г.І. Камунікатыўна і нарматыўна арыентаваныя заданні для развіцця і замацавання маўленчых уменняў на матэрыяле віншавальных выказванняў / Г.І.Нікалаенка, І.У.Таяноўская [і інш.]. – Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/handle/123456789/175206. – Дата доступу: 2019.
14. Падабайкі на роднай мове //// – Режим доступа:http://padabayki.ru.
15. *Саматыя, І. М., Саматыя Р. І.* Выкарыстанне клоўз-тэста на ўроках беларускай мовы як спосаб фарміравання прадметнай і метапрадметнай кампетэнцый/– http://elib.bsu.by/bitstream/123456789/125285/1/I._M._Саматыя__P._I._Саматыя.pdf
16. *Саматыя, І.М.* Арганізацыя праектнай дзейнасці на ўроках мовы і літаратуры /І.М.Саматыя // Матэрыялы XI Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : да 900-годдзя Кірыла Тураўскага і 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі” – Мінск, 2014. С.374-380.
17. *Саматыя, І.М.* Беларуская мова. 8 клас. Гэты няпросты просты сказ: дапам. Для вучняў агульнаадукац. Устаноў з беларус. І рус. Мовамі навучання / І.М. Саматыя, В.С. Палтаржыцкая. – Мінск: Аверсэв, 2011.
18. *Саматыя, І.М.* Гэты няпросты просты сказ: 8 клас: вучэб.-метад. Комплекс / І.М.Саматыя, В.С. Палтаржыцкая. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.
19. *Саматыя, І.М.* Вывучэнне тэкстаўтваральнай ролі парадку слоў на ўроках беларускай мовы ў 8 класе /І.М.Саматыя // Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования: сб. науч. Ст. / Белорус. Гос. Ун-т; в авт. Ред. – Мінск, 2014. – Вып. 13. С.78-86.
20. *Саматыя, І.М.* Метапрадметная роля курса роднай мовы ў сярэдніх агульнаадукацыйных установах /І.М.Саматыя // Матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі “Канцэптуальныя падыходы да рэалізацыі зместу філалагічнай адукацыі ў школе і ВНУ” Брэст : БрДУ імя Пушкіна, 2014. С.192-194.

21. *Саматыя, І.М.* Методыка выкладання З.Б.Вурановіч // Філалагічная адукацыя : навук.- метад. Зб./ рэдкал. : А.І.Бельскі (гал. Рэд.) [і інш.] – Мінск : БДУ , 2011. – Вып. 2. С.53-57.
22. *Саматыя, І.М.* Сшытак на друкаванай аснове як састаўная частка вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай мове (8 клас) /І.М.Саматыя // Коммуникативная компетенция : принципы, методы, приёмы формирования : сб. науч. Ст. / Белорус. Гос. Ун-т; в авт. Ред. – Минск : Право и экономика, 2012. – Вып.11.С.61-66.
23. *Саматыя, І.М.* Фарміраванне каштоўнаснага погляду на родную мову/І.М.Саматыя//Современная образовательная среда: Приоритетные направления развития : материалы международной научной конференции. – Минск, 2010. – С. 111-116.
24. Таяноўская, І.У. Рэсурсы ўдасканалення маўленчай і этыкетнай культуры вучняў з апорай на выкарыстанне эўрыстычных заданняў / І.У.Таяноўская, Г.І.Нікалаенка//Зборнік навук.прац Акад.паслядыплом.адукацыі. – 2017. – Вып. 16.
25. Творчае дамашняе заданне на ўроках беларускай мовы // – Режим доступа: http://www.nastaunik.info/node/16647 . –Дата доступу 28.01.2019
*26. Цэдрык, С.Л.* Матывацыйная дзейнасць настаўніка і вучняў на розных этапах урока: арганізацыйна-матывацыйным, інфармацыйна-пошукавым і кантрольна-рэфлексійным /С.Л.Цэдрык // Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования: сб. науч. Ст. / Белорус. Гос. Ун-т; в авт. Ред. – Мінск, 2014.– Вып. 13. С.109-113.
27. *Яленскі М. Г., Свірыдзенка В. І.* Маўленчая культура вучняў: як навучыць дакладна выказваць свае думкі ........................2016…..... №6 с.17–20.
Інтэрнэтрэсурсы:
28. adu.by
29. nastaunik.info
30. blendspace.com (Стварэнне адукацыйных міксаў)
31. easy notecards (Сайт для стварэння флэш-картак)
32. eslvideo.com (Стварэнне віктарын на аснове відэа)
33. jigsawplanet.com (Сайт для стварэння пазлаў)
34. learningapps (Рэсурс з шаблонамі адукацыйных гульняў’
35. mind42.com (Стварэнне інтэлектуальных карт)
36. photopeach.com (Стварэнне слайдшоу і віктарын)
37. prezi.com (Рэсурс для стварэння прэзентацый новага пакалення)
38. quizlet.com (Сайт для стварэння гукавых флэш-картак)

## Прыкладны пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі і методыка фарміравання выніковай ацэнкі

Да ліку рэкамендаваных прыкладных формаў належаць

- калёквіум,
- эсэ,
- рэферат,
- прэзентацыя,
- відэаматэрыялы,
- справаздача,
- даклад,
- агляд літаратуры і інш.

**Прыкладны пералік заданняў для кіруемай самастойнай работы студэнтаў**

Тэма 9. КСР № 1. Аналіз вучэбных дапаможнікаў "Беларуская мова : 5-6 класы" (2 гадз.). Аналіз мае на мэце вызначэнне наяўнасці ў дапаможніках тэарэтычных звестак пра функцыі вывучаемых моўных адзінак, характарыстыку сістэмы практыкаванняў. Форма кантролю – аналітычнае выказванне-характарыстыка.

Тэма 11. КСР № 2. Аналіз вучэбных дапаможнікаў "Беларуская мова : 7-9 класы" (2 гадз.).

Аналіз мае на мэце вызначэнне наяўнасці ў дапаможніках тэарэтычных звестак пра функцыі вывучаемых моўных адзінак, характарыстыку сістэмы практыкаванняў. Форма кантролю – аналітычнае выказванне-характарыстыка.

**Прыкладная тэматыка семінарскіх (практычных, лабараторных) заняткаў**

Практычныя заняткі № 1. Вывучэнне фанетыкі, словаўтварэння ў функцыянальным аспекце.
Практычныя заняткі № 2. Функцыянальны падыход да вывучэння лексікалогіі і лексікаграфіі.
Практычныя заняткі № 3. Функцыянальны падыход да вывучэння марфалогіі.
Практычныя заняткі № 4. Функцыянальны падыход да вывучэння сінтаксісу.
Практычныя заняткі № 5. Функцыянальна-камунікатыўны аспект працы з тэкстам пры вывучэнні беларускай мовы.

**Апісанне інавацыйных падыходаў і метадаў да выкладання вучэбнай дысцыпліны (эўрыстычны, праектыўныя, практыка-арыентаваны)**

**Формы рэалізацыі навучальнага працэсу**

Навучальны працэс рэалізуецца з дапамогай як традыцыйных, так і новых адукацыйных тэхналогій (праблемнае і праектнае навучанне, гульнявыя тэхналогіі, інтэрактыўныя тэхналогіі, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі і г.д.). Выкарыстоўваюцца новыя формы самастойнай работы студэнтаў (прэзентацыі, рэцэнзаванне, прагляд відэалекцый, праца з камп'ютарнымі трэнажорамі, праца з электроннымі падручнікамі і інш.).

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы навучэнцаў**

Для арганізацыі самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне выкарыстоўваюцца сучасныя інфармацыйныя рэсурсы: размяшчэнне на адукацыйным партале комплексу навучальных і вучэбна-метадычных матэрыялаў (вучэбна-праграмныя матэрыялы, навучальнае выданне для тэарэтычнага вывучэння дысцыпліны, метадычныя ўказанні да практычных заняткаў, матэрыялы бягучага кантролю і бягучай атэстацыі, якія дазваляюць вызначыць адпаведнасць вучэбнай дзейнасці навучэнцаў патрабаванням адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі і вучэбна-праграмнай дакументацыі, у т. л. пытанні для падрыхтоўкі да заліку, заданні, пытанні для самакантролю, тэматыка рэфератаў і інш., спіс рэкамендуемай літаратуры, інфармацыйных рэсурсаў і інш.).

Адзнака за адказы на лекцыях (апытанне) і практычных занятках можа ўключаць у сябе паўнату адказу, наяўнасць аргументаў, прыкладаў з практыкі і г.д.

Пры ацэньванні рэферата (дакладу) звяртаецца ўвага на: змест і паўнату раскрыцця тэмы, структуру і паслядоўнасць выкладу, крыніцы і іх інтэрпрэтацыю, карэктнасць афармлення і г.д.

Адзнака эсэ (сачынення, артыкула) можа фармавацца на аснове наступных крытэрыяў: арыгінальнасць (навізна) пастаноўкі праблемы і спосабу яе інтэрпрэтацыі / рашэння, самастойнасці і аргументаванасці меркаванняў, пісьменнасці і стылю выкладу і г.д.

Пры ацэнцы партфоліо работ студэнта неабходна звяртаць увагу на: абгрунтаванасць і лагічнасць ўключэння работ, сведчанні якасці работ студэнта (водгукі, рэцэнзіі, ацэнкі і г.д.), сістэматычнасць працы з партфоліо, наяўнасць самаацэнкі студэнтам уласных работ (рэфлексіўныя заўвагі, рэплікі, каментары, праекты змяненняў).

Пры ацэнцы адкрытага (эўрыстычнага) задання неабходна ўлічваць: самабытнасць (арыгінальнасць) створанага адукацыйнага прадукта, даследаванне вывучаемага феномену з розных бакоў, інтэграванне ведаў з розных абласцей, асобасную значнасць дасягнутых вынікаў.

Ацэнка праекту можа ўключаць актуальнасць даследаванай праблемы, карэктнасць метадаў даследавання, выкарыстоўваюцца, прыцягненне ведаў з розных абласцей, арганізацыя працы групы, практыкаарыентаванасць атрыманых вынікаў.

*Формай бягучай атэстацыі* па дысцыпліне вучэбным планам прадугледжаны залік.

Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі і методыка фарміравання выніковай адзнакі. Выкарыстоўваецца рэйтынгавая ацэнка ведаў студэнта, што дае магчымасць прасачыць і ацаніць дынаміку працэсу дасягнення мэт навучання. Рэйтынгавая ацэнка прадугледжвае выкарыстанне прапарцыянальных каэфіцыентаў для бягучага кантролю ведаў і бягучай атэстацыі студэнтаў па дысцыпліне.
Прыкладныя прапарцыянальныя каэфіцыенты, якія вызначаюць долю бягучага кантролю ведаў і бягучай тэстацыі студэнтаў па дысцыпліне:

- адказы на практычных занятках, удзел у дыскусіях — 25 %;
- напісанне эсэ — 25 %;
- падрыхтоўка вуснага паведамлення — 10 %;
- падрыхтоўка рэферата — 25 %;
- тэсціраванне — 15 %.

Рэйтынгавая ацэнка па дысцыпліне разлічваецца на падставе ацэнкі бягучай паспяховасці і ацэнкі за выніковую атэстацыю з улікам іх прапарцыянальных каэфіцыентаў. Ацэнка па бягучай паспяховасці складае 50%, ацэнка па выніковай атэстацыі — 50%.

## Прыклады тэматыкі рэфератыўных работ

1. Метапрадметная роля курса роднай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
2. “Гэты няпросты просты сказ”.
3. Фарміраванне каштоўнаснага погляду на родную мову.
4. Маўленчая культура вучняў: як навучыць дакладна выказваць свае думкі.

## Прыкладны пералік пытанняў да заліку

1. Паняцце функцыянальнай лінгвістыкі. Асноўныя напрамкі функцыянальнай лінгвістыкі.
2. Паняцце функцыянальнага падыходу ў методыцы выкладання лінгвістычных дысцыплін.

3. Роля роднай мовы ў жыцці грамадства.
4. Сістэма сярэдняй адукацыі ў Беларусі і месца ў ёй беларускай мовы як вучэбнай дысцыпліны.
5. Арганізацыя вучэбнага працэсу па беларускай мове.
6. Прынцып навучання беларускай мове як поліфункцыянальнай з'яве.
7. Перспектыўныя педагагічныя тэхналогіі.
8. Вывучэнне фанетыкі ў функцыянальным аспекце.
9. Функцыянальны падыход да вывучэння словаўтварэння.
10. Функцыянальны падыход да вывучэння лексікалогіі і лексікаграфіі.
11. Вывучэнне марфалогіі ў функцыянальным аспекце.
12. Вывучэнне сінтаксісу ў функцыянальным аспекце.
13. Функцыянальна-камунікатыўны аспект працы з тэкстам пры вывучэнні беларускай мовы.
14. Аналіз урокаў беларускай мовы з выкарыстаннем камунікатыўнага падыходу.

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА**

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы пра змены ў змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Агульнае мовазнаўства | Кафедра тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства | Змен няма | Дадатковае ўзгадненне не патрабуецца, пратакол № 10 ад 23.05.2018 г. |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЯНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**
**на _____ / _____ вучэбны год**

| № п/п | Дапаўненні і змяненні | Прычына |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
______________________________ (пратакол № ____ ад ________ 201_ г.)

Загадчык кафедры
______________________ ________________ ___________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта
______________________ ________________ ___________________